# Нагойскі пратакол у дзеянні



Фота Вольгі ПРАЛЮК

**У нашай краіне рэалізоўваецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі ПРААН-ГЭФ “Узмацненне людскіх рэсурсаў, прававых сістэм і інстытуцыйнага патэнцыялу для рэалізацыі Нагойскага пратаколу ў Рэспубліцы Беларусь”. Праект аб’ядноўвае біёлагаў, медыкаў, работнікаў культуры і так званых носьбітаў традыцыйных ведаў, гэта значыць людзей, якія шмат ведаюць пра лекавыя расліны і іх выкарыстанне ў народнай медыцыне. Аснова праекту — Нагойскі пратакол, дакумент, з якім жыхары нашай краіны пакуль мала знаёмыя.**

Падпісанню гэтага важнага дакумента папярэднічала прыняцце ў 1993 годзе Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці. У працяг яго дзеяння Сусветны саміт па ўстойлівым развіцці ў 2002 годзе заклікаў выпрацаваць адзіную лінію заахвочвання і забеспячэння роўнага размеркавання выгод ад выкарыстання гэтых рэсурсаў. Перамовы і прывялі да падпісання ў кастрычніку 2010 года Нагойскага пратаколу (Японія).

Пратакол заклаў трывалую аснову для забеспячэння пастаўшчыкам і карыстальнікам генетычных рэсурсаў прававой дакладнасці. Акрамя таго, палажэнні пратаколу аб доступе да традыцыйных ведаў карэнных і мясцовых суполак, звязаных з генетычнымі рэсурсамі, пашыраюць магчымасці абшчын атрымліваць выгоды ад ужывання іх ведаў і практыкі. Пратакол стымулюе выкарыстанне генетычных рэсурсаў і звязаных з імі традыцыйных ведаў і ўмацоўвае магчымасці сумеснага здабывання выгод. Тым самым ён будзе ствараць стымулы да захавання біялагічнай разнастайнасці і ўстойлівага развіцця яго кампанентаў для далейшага павелічэння дабрабыту чалавека.

> Міжнародныя дакументы, якія закранаюць так званае “зялёнае” заканадаўства, усё часцей з’яўляюцца ў Беларусі, і Нагойскі пратакол — адзін з іх. Яго паспяховая рэалізацыя — задача не толькі спецыялістаў, але і экалагічна свядомых грамадзян.

Аляксандр Корбут, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, адзначыў станоўчую дынаміку ў рэалізацыі Нагойскага пратаколу ў нашай краіне:

— У беларускіх траў ёсць вялікі лекавы патэнцыял, іх можна прымяняць для вырабу прэпаратаў, гарбаты, настояў. Неабходна перадаваць народныя веды новаму пакаленню для вывучэння і прымаць на ўзбраенне ў медыцыне, вытворчасці. Пры гэтым асаблівую ўвагу мы надаём пытанню захавання чырвонакніжных відаў раслін.

Алена Гузенка, намеснік дырэктара Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, распавяла:

— Нашы спецыялісты, роўна як і работнікі Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра па пытаннях доступу да генетычных рэсурсаў і сумеснага выкарыстання выгод, актыўна ўдзельнічалі ў праекце ПРААН-ГЭФ “Узмацненне людскіх рэсурсаў, прававых сістэм і інстытуцыйнага патэнцыялу для рэалізацыі Нагойскага пратакола ў Рэспубліцы Беларусь”. Хачу адзначыць, што вывучэнне генетычных рэсурсаў заўсёды звязана з носьбітамі традыцыйных ведаў, гэта значыць з простымі людзьмі, таму сёння вельмі важна распрацаваць этычны кодэкс для рэгулявання спрэчных пытанняў.

**Вольга ПРАЛЮК**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА